Назва ТВП: Пойма Пцічы

© С. Левый

Код: BY031

Геаграфічныя каардынаты: 52° 41' N 28° 47' E

Адміністрацыйная прыналежнасць: Гомельская вобласць: Кастрычніцкі раён, Магілёўская вобласць: Глускі раён

Плошча: 12 га

Крытэрыі: A1

Нацыянальны прыродаахоўны статус: цэнтралья частка тэрыторыі біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Акцябрскі»

Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП міжнароднай значнасці

Агульнае апісанне:

ТВП размешчана ў паўднёва-усходней частцы Беларусі ў 5 км на захад ад г.п. Акцябрскі. Уключае пойму ракі Пціч на працягу больш за 70 км. Цэнтральная цастка ТВП – біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння “Акцябрскі”.

Пойма р. Пціч са старыцамі, пратокамі і забалочанымі ўчасткамі з комплексам водна-балотнай расліннасці і фауны захавалася ў натуральным стане і з'яўляецца каштоўным прыродным тэрытарыяльным комплексам. Рэчышча р. Пціч, асноўнай воднай артэрыі ТВП, моцна звілістае, вольна меандрыруе, разгалінаванае пратокамі, утварае затаплеваемыя і парослыя чаротам выспы. Рэчышча зарастае

воднай расліннасцю, пераважна ў берагоў, на асобных участках па ўсёй шырыні. Даліна ракі шырынёй 2-5 км.

У межах ТВП расце больш за 500 відаў вышэйшых судзістых раслін, у тым ліку 17 відаў дрэў. Ва ўзроставым складзе дрэвастояў значная доля стараўзростных лясоў. Сярод хвойнікаў і дуброў выяўлены дрэвастоіўзростам 140 гадоў, сярод ельнікаў і ясенников - 110 гадоў. Аднак у лясах можна сустрэць і асобныя дрэвы дуба і елкі ўзростам да 200 гадоў. Чорнаальшаннікі складаюць каля паловы ад усей плошчы лясоў.

Гаспадарчае выкарыстанне: лясная і сельская гаспадарка; сельскагаспадарчыя ўгоддзі прадстаўленыя, галоўным чынам, сенажацямі і пашамі. Прамысловыя прадпрыемствы і населеныя пункты ў граніцах ТВП адсутнічаюць.

Асноўныя біятопы:

Лугі – каля 30%, хмызнякі і рэдкалессе – каля 35%, лясы – каля 25% (у тым ліку: чорнаальховыя 13%), балоты – каля 7%, рэкі і іх узбярэжжы – 3%.

Птушкі:

Сярод птушак ТВП пераважаюць віды, якія адзначаны на гнездаванні. Дакладна гняздзяцца 120 відаў, 3 віда, верагодна гняздзяцца, 7 відаў рэгулярна наведваюць дадзеную тэрыторыю, пераважна ў пошуках корму.

Тэрыторыя мае значэнне для захавання некалькіх пар вялікага арляца *Aquila clanga.*

Іншыя групы жывел:

На тэрыторыі ТВП адзначана 32 віда рыб, 8 відаў амфібій, 5 відаў рэптылій, 43 віда звяроў.

Стан рэдкіх відаў птушак:

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Чапля-бугай *Botaurus stellaris*	гн	20-25 с	2003-2010	Э		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Чорны бусел *Ciconia nigra*	гн	2-5 п	2003-2010	Э		
Малы арлец *Aquila pomarina*	гн	1-3 п	2003-2010	Э		
Арлец вялікі *Aquila clanga*	гн	2 п	2010	Д	↓	A1
Сокал-кабец *Falco subbuteo*	гн	1-5 п	2003-2010	Э		
Журавель шэры *Grus grus*	гн	2-5 п	2003-2010	Э		
Грыцук вялікі *Limosa limosa*	гн	+	2003-2010	П		
Звычайны зімародак *Alcedo atthis*	гн	10-15 п	2003-2010	Э		
Жаўна зялёная *Picus viridis*	гн	+	2003-2010	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды	Крытерый ТВП
Сініца белая *Cyanistes cyanus*	гн?	+	2003-2010	П		

Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Расліны: пылкагалоўнік чырвоны*Cephalantherarubra,* зубніца клубняносная *Dentariabulbifera,* баранец звычайны *Huperziaselago,* чараўнік зеленакветкавы *Platantherachlorantha,* фіялка багнавая*Violauliginosa*.

Пагрозы:

- Негатыўнае ўздзеянне асушальнай меліярацыі на прылегаючыя ўчасткі поймы, дэградацыя лясных фітацэнозаў у зоне яе ўздзеяння.
- Значнае ўзмацненне фактару турботы падчас вясновых паляванняў.
- Браканьерства.
- Негатыўны ўплыў прыбярэжных населеных пунктаў, якія знаходзяццакаля поймы ракі: забруджванне бытавымі адыходамі, вытаптыванне і рудэралізацыя расліннага покрыва, узрастанне драпежніцкага і канкурэнтнага прэса сінантропных і хатніх жывёл.

Рэкамендацыі па захаванню:

- Не праводзіць меліярацыйных мерапрыемств у пойме р. Пціч.
- Забарона веснавого палявання, асабліва ў межах заказніка. Выдзяленне зон пакою.

Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Дамброўскі В.Ч.

Научное и технико-экономическое обоснование создания Республиканского

биологического заказника «Октябрьский», Минск, 2000 г.

Складальнікі : Дамброўскі В.Ч.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*